**Грамадскае аб’яднанне “Міжнародная асацыяцыя беларусістаў”**
**Філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта**
**Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі**
**Польскі Інстытут у Мінску**

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

Паважаныя калегі!
Запрашаем Вас прыняць удзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі **“Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя і гісторыка-культурныя сувязі”**, якая адбудзецца 21–23 чэрвеня 2018 г. у Мінску.

Асаблівасцю сёлетняй канферэнцыі стане тое, што яна прысвячаецца 220-годдзю з дня нараджэння Адама Міцкевіча, а таму заахвочваем да пашырэння міцкевічазнаўчай тэматыкі Вашых выступленняў. Аднак пры гэтым праблемнае поле канферэнцыі застаецца, як заўсёды, шырокім і разнастайным, яно ўключае актуальныя навуковыя пытанні ў галіне беларуска-польскіх моўных, літаратурных, фальклорных і гісторыка-культурных узаемасувязей ад старажытнасці да сучаснасці.

У межах канферэнцыі плануецца правядзенне круглага стала, прысвечанага памяці выдатных польскіх беларусістаў, – мовазнаўцы Антаніны Абрэмбскай-Яблоньскай і этнолага Юзэфа Абрэмбскага.

Для ўдзельнікаў канферэнцыі і круглага стала плануецца наведванне знакавых мясцін, звязаных з жыццём і дзейнасцю Адама Міцкевіча (Завоссе, Навагрудак).

Канферэнцыя адбудзецца на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (г. Мінск, вул. Карла Маркса, д. 31); круглы стол плануецца правесці ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі (г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2).

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі просім дасылаць да 10 красавіка 2018 года на адрас belpolkanf@tut.by (форму заяўкі гл. ніжэй).

Арганізацыйны ўнёсак для ўдзельнікаў з Польшчы складае 30 €, для ўдзельнікаў з Беларусі – 10 €. Выдаткі на праезд, пражыванне, харчаванне – за кошт удзельнікаў канферэнцыі.

Па матэрыялах канферэнцыі плануецца выданне зборніка навуковых артыкулаў у серыі “Беларусіка=Albaruthenika”. Тэкст даклада здаецца падчас рэгістрацыі або дасылаецца на адрас belpolkanf@tut.by да 30 чэрвеня 2018 года.

**Патрабаванні да афармлення матэрыялаў**

Аб’ём – да 10 старонак у рэдактары Word. Палі: левае 3 см, астатнія па 2 см; шрыфт Times New Roman, 14 кегль – для асноўнага тэксту, 12 кегль – для бібліяграфічнага спіса і зносак; абзац – 1,25 см; інтэрвал 1; старонкі не нумаруюцца; ілюстрацыйны матэрыял падаецца курсівам; можа выкарыстоўвацца выдзяленне тлустым шрыфтам; схемы і табліцы падаюцца як ўстаўкі ў асноўны тэкст. Дапускаюцца аўтаматычна прастаўленыя зноскі ўнізе старонкі, нумарацыя “на кожнай старонцы”. Калі акрамя Times New Roman дадаткова выкарыстоўваюцца іншыя шрыфты (сімвалы), то яны падаюцца ў электронным выглядзе асобнымі файламі. Крыніцы ў бібліяграфічным спісе падаюцца ў алфавітным парадку, спіс нумаруецца аўтаматычна і размяшчаецца ў канцы артыкула пасля слова “Літаратура”.

У першым радку справа ўказваюцца імя і прозвішча аўтара, у дужках – горад, краіна. Назва артыкула падаецца праз радок вялікімі тлустымі літарамі. Асноўны тэкст размяшчаецца праз радок ад назвы. Спасылкі ў тэксце афармляюцца ў квадратных дужках: [2, с. 31], дзе першая лічба – нумар у спісе літаратуры, наступныя лічбы – старонкі.

Чакаем Вас у чэрвені ў Мінску!
З найлепшымі пажаданнямі

Ад імя аргкамітэта:
Старшыня Рэспубліканскага аддзялення
Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў
Ірына Багдановіч, ibogdana@yandex.ru
Тэл.: +375 29 393 96 29

Сакратар аргкамітэта канферэнцыі
Марына Свістунова, belpolkanf@tut.by

**ЗАЯЎКА**

на ўдзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі
“Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя
і гісторыка-культурныя сувязі”

21–23 чэрвеня 2018 г., Мінск

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па-бацьку | |
| Месца працы, пасада | |
| Вучоная ступень, званне | |
| Тэма даклада | |
| E-mail | |
| | |
| Патрэба ў гатэлі | |
| Даты мяркуемага засялення ў гатэль | |
| | |
| Патрэба ў візе | |
| Даты, на якія патрэбна адкрыць візу | |
| Калі ласка, дашліце фота ці скан старонкі пашпарта з фота і асабістымі дадзенымі для афармлення запыту на атрыманне візы! | |